# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі
## IV клас*

***Аб'язджаць.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго. Пастаўце націск у слове.*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | 2 | 8 | 4 | 7 | 3 | 5 | 1 | 10 | 9 |
| д | Б | а | я | ж | ' | з | а | ь | ц |

*Вызначыце, якой часцінай мовы з'яўляецца слоўнікавае слова.*

*2. Знайдзіце і запішыце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове.*

аб'язджаць ______________

*3. Дапоўніце сказы дзеясловам **аб'язджаць** у форме цяперашняга часу. Вызначыце асобу і лік дзеяслова ў сказах.*

Я ____________ лужыны на самакаце.
Ты ____________ ямы вельмі акуратна.
Ён ____________ парк на веласіпедзе.
Мы ______________ на аўтобусе ўвесь горад.
Вы ____________ за год шмат гарадоў Беларусі.
Яны ______________ на машыне некалькі краін у час адпачынку.

*4. У радзе літар знайдзіце і абвядзіце слоўнікавыя словы:*

УВЕРСЕКУНДАХВОТНАБ'ЯЗДЖАЦЬ

*5. Што абазначае выраз?*

свет аб'ехаць

| пабыць усюды, у розных месцах | нідзе не бываць |
|---|---|

*Злучыце выраз з яго значэннем.*
*Прачытайце размову бацькі з дачкой.*

Бацька запытаў у дачкі:
— Аб чым ты марыш, Ульяна?
— Я хачу **пабываць у розных краінах** (______), як і ты, — адказала Ульяна.

*Які выраз можна выкарыстаць замест выдзеленага спалучэння слоў? Дапішыце гэты выраз у дужках.*

***Уверсе.***

*1. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

в у е

..верс..

*2. Закрэсліце літару, што паўтараецца. Запішыце слова, якое атрымалася.*

У Я В Я Е Я Р Я С Я Е Я

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове. Падзяліце слова на склады вертыкальнымі лініямі ( | ).*

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

У верхняй частцы чаго-небудзь — гэта _______.

*4. Дапішыце сінонімы да прапанаваных слоў.*

У вышыню, угору, _________.
Угары, _________.

***Словы для даведкі:*** уверх, уверсе.

*5. Дапоўніце скорагаворку слоўнікавым словам. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.*

Я лічу на небе зоркі.
Іх ___________ многа столькі!
Палічу, можа, за **месяц**.
Памажы мне, браце **Месяц**.
*(Ніна Галіноўская**)*

*Растлумачце напісанне першай літары ў выдзеленых словах.*

*6. Дапоўніце народную прымету слоўнікавым словам.*

Перад градабоем чуваць, як _________ гудзе.

***Градабой** — выпадзенне граду, які знішчае пасевы, сады.*

**_Свірыдзенка В. І._**, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
**_Антановіч Н. М._**, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.
** *Галіноўская, Н. В.* Клубок і калабок / Ніна Галіноўская. — Мінск : Юнацтва, 1999. — С. 120.